## § 11. Пераходныя і непераходныя дзеясловы (азнаямленне)

**62.** Прачытайце словазлучэнні. Пастаўце пытанні ад галоўнага слова да залежнага. Вызначце склон назоўнікаў.

| | |
|---|---|
| памыць падлогу | дапамагчы бацькам |
| збіраць грыбы | увайсці ў кабінет |
| надрукаваць аб'яву | спрачацца з братам |

Пры якіх дзеясловах назоўнікі ўжываюцца ў вінавальным склоне без прыназоўніка?

**Пераходныя дзеясловы** абазначаюць дзеянне, якое непасрэдна накіравана на прадмет. Пры пераходных дзеясловах назоўнікі ўжываюцца:

- у форме вінавальнага склону без прыназоўніка: ***вышываць*** (ш т о?) *кашулю*, ***разглядаць*** (к а г о?) *матылька*;
- у форме роднага склону без прыназоўніка: а) калі дзеянне пераходзіць на частку прадмета: ***насыпаць*** (ч а г о?) *цукру*, ***выпіць*** (ч а г о?) *кефіру*; б) калі перад дзеясловам ёсць адмоўная часціца ***не***: ***не чакаў*** (ч а г о?) *запрашэння*, ***не знайшоў*** (ч а г о?) *баравікоў*.

**Непераходныя дзеясловы** абазначаюць дзеянне, якое не накіравана непасрэдна на прадмет. Пры непераходных дзеясловах назоўнікі ўжываюцца ў форме ўскосных склонаў без прыназоўніка і з прыназоўнікам (акрамя вінавальнага і роднага склонаў без прыназоўніка): ***ганарыцца*** (ч ы м?) *перамогай*, ***жартаваць*** (з к а г о?) *з брата*.

**63.** Выпішыце сказы з пераходнымі дзеясловамі. Падкрэсліце дзеясловы як члены сказа.

1. Праз гадзіну ў падземны пераход метро ўбегла прыгожая ўсмешлівая дзяўчына *(А. Камароўскі)*. 2. Сонца выпіла апошнія лужынкі снегавой вады *(Я. Галубовіч)*. 3. Хлопчык адной рукой прыціскаў козачку да зямлі, а другой гладзіў па маленькай


Правообладатель Национальный институт образования

галоўцы, разглядаў рыжаватую плямістую поўсць *(В. Гурскі)*. 4. З дарогі мы збочылі на непрыкметную сцежку *(Р. Ігнаценка)*. 5. Пірог заўсёды ўпрыгожваў наш[м] стол *(Я. Сіпакоў)*. 6. Красавіцкі лес аж звінеў ад птушыных галасоў *(У. Ягоўдзік)*.

● Абазначце ў дзеясловах прыстаўкі.

**64.** Прачытайце тэкст, устаўляючы прапушчаныя назоўнікі ў форме вінавальнага склону. Абгрунтуйце падзел тэксту на абзацы.

Людзі будуюць ... для таго, каб здабываць з-пад зямлі розныя карысныя ... . У Беларусі самыя вядомыя з іх знаходзяцца ў Салігорску. Тут здабываюць калійную ... , якая дапамагае зямлі быць урадлівай.

У шахце сёння не толькі працуюць, але і адпачываюць. На глыбіні каля трохсот метраў размяшчаецца спелеалячэбніца (грэч. *speleon* — пячора). Яе наведвальнікі лечаць ... дыхання *(Паводле Л. Мінкевіч)*.

Словы для даведкі: *соль, шахты, хваробы, выкапні.*

Выпішыце з тэксту словазлучэнні «пераходны дзеяслоў + назоўнік».

Карыстаючыся прыведзенай у тэксце інфармацыяй, раскрыйце значэнні слоў *спелеатурызм*, *спелеатэрапія*, *спелеолаг*. Да якой лексікі паводле паходжання (спрадвечна беларускай ці запазычанай) адносяцца гэтыя словы?

**65.** Прачытайце тэкст, ужываючы дзеясловы, што ў дужках, у форме цяперашняга часу. У якім сказе заключаецца асноўная думка тэксту?

### Павуціна крыжавіка

Хітра і тонка *(плесці)* павуціну павук-крыжавік. Уверсе, між дрэў ці галін, ён *(замацоўваць)* сваю першую нітку. Пасля *(спускацца)* з ёй і *(раскалыхвацца)*, пакуль не захопіць бакавы ствол. Але самае цяжкае[ф] для яго — ту́га нацягнуць папярочку, каб сетка вібрыравала ад лёгкага дотыку. Калі аснова рамкі гатова, крыжавік *(пускаць)* радыяльныя* павуцінкі-промні, а пасля лёгка *(злучаць)* радыусы кругамі.


Правообладатель Национальный институт образования

Не ўсе ніткі, з якіх сплецена сетка, аднолькавыя. Пасярэдзіне, дзе *(сядзець)* павук, яны гладкія, сухія і шаўкавістыя. А далей ад цэнтра — клейкія, з мноствам вузельчыкаў *(Паводле А. Камароўскага)*.



Выпішыце з тэксту дзеясловы, якія перадаюць дзеянні павука, разам з залежнымі назоўнікамі. Падкрэсліце пераходныя дзеясловы.
Карыстаючыся выпісанымі словазлучэннямі як апорнымі, вусна перакажыце тэкст.
Разгледзьце фотаздымак. Чаму павук-крыжавік атрымаў такую назву?

## § 12. Зваротныя і незваротныя дзеясловы (азнаямленне)

**66.** Прачытайце сказы. Назавіце дзеясловы, якія заканчваюцца на ***-ся***.

1. Спелае жыта схіліла каласы *(М. Гарэцкі)*.

2. Бабуля прытуліла Алёнку да сябе *(В. Ткачоў)*.

3. Юная рабінка
Да акна схілілася
І да шкла галінкай
Тонкай прытулілася.
*А. Данільчык.*

Растлумачце розніцу ў лексічных значэннях слоў *схіліла — схілілася, прытуліла — прытулілася*.

**Зваротныя дзеясловы** — гэта дзеясловы з постфіксам ***-ся***: *схаваў**ся**, знайшлі**ся***.

**Незваротныя дзеясловы** — гэта дзеясловы без постфікса ***-ся***: *схаваў, знайшлі*.

У інфінітыве, а таксама ў формах 3-й асобы адзіночнага і множнага ліку цяперашняга і будучага часу постфікс ***-ся*** пераходзіць у ***-ца (-цца)***: *хвалявац**ца**, хвалюе**цца**, хвалююц**ца***.

Сярод зваротных дзеясловаў ёсць такія, якія не маюць адпаведных незваротных: *баяц**ца**, прачнуц**ца**, смяяц**ца*** і інш.



Правообладатель Национальный институт образования

**67.** Размяркуйце зваротныя дзеясловы на групы ў залежнасці ад значэнняў. Запішыце іх.

Радавацца, кусацца, абувацца, пасварыцца, мыцца, бадацца, крыўдзіцца, прычэсвацца, сустракацца, калоцца, шаптацца, спалохацца.

1. Дзеянне, накіраванае на самога сябе: ... .
2. Сумеснае дзеянне дзвюх ці некалькіх асоб: ... .
3. Пачуцці, перажыванні: ... .
4. Уласцівасці рэчаў, жывых істот: ... .

З двума дзеясловамі (на выбар) складзіце і запішыце сказы.

**68.** Прачытайце тэкст. Як вы разумееце сэнс выказвання «Чысціня — у характары беларусаў»?

Калі ў замежных турыстаў пытаюц..а, за што ім падабаец..а Беларусь, яны амаль заўсёды адзначаюць[с] чысціню ..уліц нашых г..радоў. Не многі.. краіны могуць ганарыц..а тым, што яны такі.. акуратны.. і дагледжаны.., як Беларусь. Чысціня — у характ..ры беларусаў. Нам падабаец..а, каб вакол было прыгожа *(Паводле Л. Мінкевіч)*.

Спішыце тэкст, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары.

Падкрэсліце зваротныя дзеясловы. Якія з іх не маюць адпаведных незваротных?

Якія рысы характару, на вашу думку, уласцівыя беларусам? Складзіце вуснае выказванне тыпу разважання на тэму «Мы, беларусы, мы — народ такі» *(Р. Барадулін)*.

**69.** Прачытайце народныя прыкметы, звязаныя з надвор’ем, утвараючы ад дзеясловаў, што ў дужках, зваротныя дзеясловы.

1. Калі ластаўкі то высока ў неба *(падымаюць + -**ся**)*, то ўніз *(кідаюць + -**ся**)*, навальніца будзе. 2. Калі пры набліжэнні[м] навальнічных воблакаў пчолы не *(хаваюць + -**ся**)* у вуллі, дажджу не будзе. 3. Калі мурашкі *(перасяляюць + -**ся**)* на высокае месца, быць лету дажджліваму. 4. Гракі *(уюць + -**ся**)* высока чародамі і *(спускаюць + -**ся**)* імкліва на зямлю — да дажджу. 5. Калі птушкі з поўдня *(вяртаюць + -**ся**)* чародамі, вясна дружнай будзе.


Правообладатель Национальный институт образования

Выпішыце са сказаў зваротныя дзеясловы. Абазначце ў іх канчаткі і постфіксы.

У якім значэнні ў апошнім сказе ўжыты прыметнік *дружны*: а) ‘звязаны дружбай, узаемнай дапамогай, выручкай’; б) ‘якія адбываецца адначасова, сумесна, бурна’?

**70.** Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак, які перадаваў бы тэму тэксту.

У к..нцы лістапад.., калі на парозе зіма, м..дзведзі залазяць у б..рлогу. Яна робіцца ў дрымучым лес.. . Пад вываратнем выкопваецца яма, засцілаецца мя..кім гал..ём, сухою лістотаю і мохам. Зверху накладваецца шмат гал..я. На яго напа́дае снег, утворыцца в..лікая гурба[л] — і ўнутры цёпла. Здагадацца, што гэта б..рлога, можна толькі па тым, што над гурбай праз адтуліну падымаецца па́ра. Гэта дыхае м..дзведзь (*Паводле А. Жука*).

Запішыце тэкст, замяняючы, дзе гэта магчыма, зваротныя дзеясловы адпаведнымі незваротнымі. Устаўце прапушчаныя літары.

Узор: *У мядзведзіцы* ***нарадзіліся*** *медзведзяняты. — Мядзведзіца* ***нарадзіла*** *медзведзянят.*

Раскрыйце сэнс выразу *на парозе зіма*.

## § 13. Трыванні дзеяслова

**71.** Прачытайце сказы. Пастаўце пытанні да дзеясловаў.

Званіў тэлефон на стале (*І. Шамякін*).

Мы ішлі вуліцамі пустога горада (*У. Караткевіч*).

Апошнім часам стары князь дужа хварэў (*В. Шырко*).

Тэлефон зазваніў надрывіста і трывожна (*А. Якімовіч*).

Хлопцы пайшлі ў арэхі (*І. Навуменка*).

Пятро прастудзіўся і захварэў (*І. Шамякін*).

Якія дзеясловы абазначаюць незакончанае дзеянне? На якія пытанні яны адказваюць?

Якія дзеясловы абазначаюць закончанае дзеянне? На якія пытанні яны адказваюць?



Правообладатель Национальный институт образования